■ Кропка на... сэрцы

# МОЦНАЯ ДУХАМ



**Сям'я Голуб чакала першынца. Дзевятнаццацігадовая Вольга ўся была ў прадчуванні шчасця мацярынства. І вось прыйшоў ён, той дзень, калі дзіця павінна было з'явіцца на свет. Але падчас родаў раптам нешта пайшло не так. Нованароджаны хлопчык атрымаў траўму і цэлы тыдзень знаходзіўся паміж жыццём і смерцю. У Юр'еў дзень ён упершыню дыхнуў самастойна, без апаратаў, таму і далі бацькі сыну імя Юрый. Праўда, тады маладая мама зусім не ўяўляла, якімі могуць быць вынікі асфіксіі, што здарылася пры родах. Але, нават калі б і ўяўляла, як упэўнена Вольга, усё роўна ніколі б не адмовілася ад сына, якой бы цяжкой ні малявалі ёй будучыню.**

Першыя месяцы ў развіцці маленькага Юры маладая мама нічога незвычайнага не заўважала. Ды і ўрачы маўчалі. Першай забіла трывогу бабуля — маці Вольгі. У бальніцы, агледзеўшы хлопчыка, сказалі, што няма ніякіх асаблівых падстаў для хвалявання. Але ішоў час, і праблемы станавіліся ўсё больш відавочнымі. А потым, як жорсткі прыгавор, прагучалі словы ўрача абласной дзіцячай кансультацыі: «У вашага сына цяжкая хвароба, верагодна, ён увогуле не будзе хадзіць». Надзея, як кажуць, памірае апошняй, таму бацькі не здаваліся. Шэсць гадоў яны ездзілі з сынам у медыцынскі цэнтр «Тонус». Але асаблівых вынікаў гэта не дало. Былі яшчэ спадзяванні на аперацыю, але і іх развеялі ўрачы, растлумачыўшы, што з такім дыягназам як дзіцячы цэрэбральны параліч самай складанай 4-й ступені, рабіць аперацыю бессэнсоўна. Бацькам заставалася сабраць усе сілы ў кулак і цярпліва несці свой крыж.

Як заўважала пісьменніца Эліза Ажэшка, ні адзін чалавек сілы сваёй не ведае, пакуль яна не спатрэбіцца. Вось і Вольга не думала, што, акружыўшы цяплом і клопатам свайго сына Юру, які не мог ні рухацца, ні размаўляць і якому кожную хвіліну патрэбна была ўвага, адважыцца стаць шматдзетнай мамай — нарадзіць яшчэ дваіх сыноў. А потым, калі яны падрастуць, пойдзе працаваць туды, дзе вельмі карысным будзе яе вопыт — памочнікам выхавальніка ў спецыяльную групу для дзетак з цяжкімі адхіленнямі ў псіхафізічным развіцці.

Асмеліцца на такі крок як нараджэнне другога дзіцяці Вользе і яе мужу Віктару было няпроста. Хоць разумелі, што праблемы са здароўем Юры былі звязаны не з генетыкай, а з ускладненнямі пры родах, думкі не давалі спакою. З палёгкай уздыхнулі толькі тады, калі пачулі, што сын нарадзіўся здаровым. А яшчэ праз тры гады Вольга стала тройчы мамай. Вялікая сям'я — вялікія клопаты. Але Вольгу гэта не пужала. Яна радавалася, што разам з меншымі дзецьмі, Артурам і Сашам, і Юра адчуваў сябе інакш. У яго з'явілася цікавасць да цацак, ён навучыўся глядзець мультфільмы. Адным словам, ажываў.

Звыклы рытм жыцця сям'і змяніўся, калі Вользе прапанавалі работу памочніка выхавальніка ў цэнтры карэкцыйна-развіваючага навучання, дзе тры гады таму адкрылася спецыяльная група для дзетак з цяжкімі адхіленнямі ў развіцці. Для новай групы яна была знаходкай, бо са свайго жыццёвага досведу добра ведала, як знайсці падыход да «асаблівага» дзіцяці, магла падказаць, дапамагчы, растлумачыць.

— На час адкрыцця групы Вольга Пятроўна была ў нас, можна сказаць, ключавой фігурай. Ні ў каго, акрамя яе, не было навыкаў работы з такімі дзецьмі. А таму і выхавальнікі, і ўвогуле ўсе мы прыслухоўваліся да яе парад, — успамінае дырэктар цэнтра Людміла Лукавец.

Але не толькі па першым часе ў групе не маглі абысціся без Вольгі. Без яе тут і сёння як без рук. Работа з «асаблівымі» дзецьмі няпростая. Памочнік выхавальніка і выхавальнік у адной звязцы і ў час заняткаў, і за абедам, калі трэба накарміць дзяцей, і на прагулцы. І так з ранку да вечара. А пасля работы Вольга спяшаецца дамоў, дзе яе чакае ў тым ліку Юра, якога ніхто не разумее так, як мама. Хоць у канцы дня маральныя і фізічныя сілы, прызнаецца Вольга, ужо на зыходзе, зранку і сям'я, і калегі зноў бачаць на яе вуснах прывычную, крыху загадкавую і заўжды шчырую ўсмешку. І яе пазітыў перадаецца іншым.

**Святлана МАКСІМУК.**
**Фота аўтара**

■

■ Лёсы людскія

# ПАКАРАННЕ



Наперадзе, крокаў за дзесяць, няспешна тупала бабуля. Яна цягнула старую сумку, прывязаную да каляскі на маленькіх колах. Сумка, было відаць, пустая. Постаць жанчыны крыху згорбленая, крокі — стомленага ўзростам чалавека. Мы рухаліся ў адным кірунку, і мне не хацелася яе абганяць. Штосьці было ў той постаці такое, што прыцягвала позірк і падказвала, што бабуля не з тутэйшых мясцін. Адлегласць між намі неўзабаве скарацілася, і, калі мы параўняліся, яна адазвалася першай:

— Дзетачка, можа, ведаеце кароткую дарогу да вакзала? — і тут жа неяк безабаронна растлумачыла. — Ногі ўжо не тыя, не хочацца іх ператамляць.

Я павярнулася адказаць, як прайсці дварамі напрасткі, і ўбачыла інтэлігентны дагледжаны тварык з прыкметамі небывалай прыгажосці ў юнацтве, але выраз яго ў гэтую хвіліну быў нейкі надта бездапаможны. Растлумачыўшы, нечакана для сябе прапанавала стаць яе спадарожніцай на некаторую частку шляху. Бабуля ўважліва паглядзела мне ў вочы і ўдзячна ўсміхнулася.

**«Піў ён, а п'яны тварыў жудасныя рэчы: біў мяне, выганяў на вуліцу. Участковы, дзякуй яму, і дапамог яго пасадзіць».**

— Не хвалюйцеся, сумку мне не трэба дапамагаць цягнуць, яна пустая, — і стала расказваць. — Тут у мяне сын у калоніі сядзіць. Прыязджала да яго, прывозіла прадукты.

Жанчына, здаецца, была рада майму з'яўленню. І, як гэта бывае ў дарозе лёгка адкрыцца спадарожніку, з якім больш ніколі не сустрэнешся, выпаліла:

— Гэта я яго пасадзіла...

Сказала тое, што яе мучыла, непакоіла і што яна мала каму б даверыла са свайго асяроддзя. Мы маўчалі. Мне здалося, бабуля чакае ад мяне асуджэння. Яе словы разанулі па сэрцы, і сапраўды хацелася ёй сказаць крыўднае: «А яшчэ маці, сына свайго не пашкадавала». У душы бурліла абурэнне: жыве для сябе, бач, якая выпешчаная, але вымавіць нічога не змагла. Жанчына, бы сапёр, які разміныраваў міну, вытрымаўшы паўзу, прадоўжыла.

— Піў ён, а п'яны тварыў жудасныя рэчы: біў мяне, выганяў на вуліцу. Участковы, дзякуй яму, і дапамог яго пасадзіць.

Стала шкада бабульку і яе сына. Колькі разоў казала сабе: не асуджай нікога. І кожны раз — на адны і тыя ж граблі. Вось не прайшло і некалькі хвілін, а ад майго гневу не засталося нічога, сітуацыя перавярнулася на 180 градусаў. Сын-алкаголік, які гэта боль для маці!

— Ён у мяне харошы. Займаўся ў мастацкай студыі, маляваў нядрэнныя карціны, надзеі падаваў, казалі выкладчыкі, але неяк няўдала ажаніўся. Яна патрабавала грошай, а ў яго зарплата маленькая, а падзарабляць удала не выходзіла. З перажывання стаў заглядваць у кілішак. Жонка яго тады выгнала, ён з гора яшчэ больш запіў. А п'яны, ён не цяміць, што робіць. Змучылася я. А нядаўна ён з маладухай звязаўся. У целе такая, пышная, але непаўналетняя аказалася. Вось на гэтым мы яго і «спалілі». Яны жылі па згодзе, ён нікога не гвалціў. Але мне ўчастковы падказаў, што за факт, што яна непаўналетняя, можна добра ўчапіцца. І ў чарговы раз, калі ён дэбашырыў, параіў напісаць заяву. Участковаму п'янкі майго сына таксама надакучылі...

Я маўчала, і, здавалася, бабуля была мне за гэта ўдзячна.

— Як ён не даваўся наручнікі адзець! Біўся, ён жа здаровы ў мяне, высокі, сіла не мераная. Але неяк звязалі, я толькі прасіла: «Не біце яго!» Паляжаў ён некалькі гадзін, працверазеў крыху, і яго павезлі...

Зноў мы ішлі моўчкі, пакуль бабуля справілася з няпрошанымі слязамі.

— Тут умовы харошыя. Чысценька. Сабрала яму, што было. Каўбаскі крыху, печыва, смятаны на рынку купіла, ён такую любіць.

Каб хоць неяк стаць суразмоўніцай, заківала ў знак згоды галавою. А бабуля раптам заспяшалася, каб паспець сказаць усё, што набалела.

— Пасадзіла яго, акаянная. І столькі гора на мяне навалілася. Памерла сястра мая адзіная. Прыехала ў Мінск яе дачка, уяўляеце, праз паўгода і яна памерла. Рак. Давялося і яе мне хаваць, а потым кватэру на сябе афармляць. Цяпер я багатая старая, — зусім не радасна заўважыла мая спадарожніца. — У сына вось пыталася, што рабіць мне з гэтай кватэрай. Плаціць за абедзве з пенсіі накладна. Кватарантам асцерагаюся здаць, убачаць, што бабка адзінокая, яшчэ заб'юць ці атруцяць. Жыллё ў Мінску вунь якое дарагое! І прадаць баюся, раптам сына выпусцяць датэрмінова. Ён жа мяне зноў выганяць будзе, успомніць усё мне. Тады б я пайшла жыць у кватэру сястры. А сын раіць прадаць, кажа: «Мама, прадай і радуйся жыццю».

Мы спыніліся, бо нашы шляхі разыходзіліся. Я паказала напрамак да вакзала, але на развітанне мне хацелася супакоіць і абнадзеіць бабулю:

— Сын ваш не будзе помсціць. І піць не будзе больш, ён пакаяўся. А вы для яго самы дарагі чалавек. Вы — маці.

Жанчына зноў працяжна, бы наскрозь, паглядзела ў мае вочы. Падалося, што яна вельмі хоча мне паверыць.

— Я малюся. Хай толькі даруе... Худы зусім, адны вочы...

Бабуля хацела яшчэ штосьці сказаць, памкнулася да мяне бліжэй, але раптам перадумала, махнула бяссільна рукой і пайшла. І постаць яе са спіны здавалася зломленай.

**Валянціна БОБРЫК,**
*г. Івацэвічы*

■

■ Вазьму твой боль...




# ШЧАСЦЕ Ў НЯШЧАСНЫХ УМОВАХ

**Мы шмат патрабуем ад жыцця. Мы заўсёды чымсьці незадаволены, нам увесь час чагосьці не хапае. І толькі заўважаючы гора суседа, гледзячы на пакуты іншых, пераацэньваем сваё становішча: а ў мяне і не так блага, як падавалася.**

У Цэнтры дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі шмат гадоў я штодня назіраю чужое гора. І гэтае назіранне ніколі не давала мне думкі, што ў параўнанні з іх праблемамі мае праблемы — нішто. Наадварот, у іх я вучуся простым жыццёвым радасцям. Тут да месца думка: маё шчасце істотна меншае ў параўнанні з іх шчасцем. Нелагічна — разумею. Я патлумачу.

Ты ў чарговы раз прыходзіш у палату праведаць сябра. Ужо прызвычайваешся да вашых размоў, жартаў, гульняў, нават забываешся, што гэта за месца і што ён хварэе на рак. Ты не рыхтуешся да нечага асаблівага. І раптам знаходзіш яго ў горшым стане. Ён не гатовы размаўляць, не рэагуе на жарты і не можа падтрымаць улюбёныя гульні. Яму дрэнна. І ты губляешся.

Проста ўзяць і сысці — няёмка, заставацца — яшчэ горш. І чулая маці, якая, у адрозненне ад цябе, прышлай сяброўкі, ні на хвіліну не забывалася, дзе яна знаходзіцца і які дыягназ у яе чада, прыходзіць табе на дапамогу. Яна ветліва ўсміхаецца, падтрымлівае размову, частуе цябе гарбатай, цікавіцца навінамі і распавядае пра будзённыя справы. Быццам бы гэта не яе дзіця зараз пакутліва зморшчылася на ложку. Яна заўважае тваю разгубленасць і адчувае твой страх. Ціха і спакойна выводзіць з няпрошаных думак. Яе ўсмешка супакойвае.

І толькі з часам ты зразумееш і ацэніш яе ўменне жыць звычайным жыццём у незвычайных умовах.

Я памятаю, якія вясёлыя пікнікі мы ладзілі ў кампаніі цяжка хворых дзяцей, адыходзячы за паўсотню метраў ад бальніцы. Я нідзе не ела больш смачных шашлыкоў, ні з кім не спявала больш душэўных песень і нідзе так не гарэзіла, як на тых пікніках.

Мы ладзілі касцюміраваныя шоу, прыдумлялі новыя танцавальныя рухі, сачынялі жартаўлівыя паэмы. Гэта было так натуральна весела, што ў той момант кожны разумеў: я шчаслівы, нягледзячы ні на што.

Я любіла ездзіць у дзіцячы анкацэнтр у часы сваіх душэўных пакут. Бо там яны знікалі і забываліся. Дзеці радавалі забавамі ў гульнявым пакоі. Мы не заўважалі кропельніц на штатывах, медыцынскіх масак ад лішніх інфекцый, перапынкаў на прыёмы лекаў. У працэсе гульні ў пакой заходзіла медсястра, падключала камусьці апарат ці дабаўляла новы шпрыц да кропельніцы. Мы не зважалі на гэтыя моманты, і яны не бянтэжылі наша моцнае пачуццё агульнай радасці.

Калі дзеці адпраўляліся на адпачынак, я далучалася да душэўных размоў матуль на агульнай кухні.

— Ну, як твае справы, Тань? Памірылася са сваім хлопцам? — з непадробным інтарэсам пыталася цёця Ліля.

— А як начальнік на рабоце, усё такі ж патрабавальны? — па-мацярынску спачувальна цікавілася Лена.

— Мы ведалі, што ты сёння прыедзеш, дык пірагоў напяклі, — далучалася да кампаніі Наташына маці.

І на гэтай кухні сапраўды знікалі ўсе мае праблемы. Не таму што я іх параўноўвала з горам матуль і іх хворых дзяцей. Не. А таму што яны ўмелі радавацца таму, што мелі. І вучылі гэтаму мяне.

ЧАСАМ я забываюся на тыя ўрокі і страчваю навыкі быць шчаслівай. Зноў шукаю тое, чаго не хапае, патрабую нешта, чаго не маю, хачу чагосьці, сама не ведаю чаго... І тады жыццё нагадвае, дае падказку.

Больш за дзесяць гадоў таму я з'ехала з роднага мястэчка і перабралася ў сталіцу. Цяпер не часта бываю на радзіме. А як прыязджаю наведаць маці, маю шмат прэтэнзій да правінцыйнага быту. Мяне абурае асартымент у крамах, злуе дрэнная мабільная сувязь, засмучае адсутнасць культурнай праграмы і недахоп цывілізацыі.

І вось я трапляю на раённае мерапрыемства, вельмі годна падрыхтаванае. Канцэрт праходзіць на адкрытай пляцоўцы ў цэнтральным парку. Усе тры гадзіны лье дождж. Публіка рознаўзроставая, шматлюдна. Адзін за адным на сцэну выходзяць мясцовыя самадзейныя спевакі, рок-гурт з суседняга раёна і нават артысты з абласной філармоніі. На дварэ змяркаецца, дождж толькі ўзмацняецца. Гледачы не разыходзяцца.

Раптам з натоўпу вылучаецца хударлявы мужчына — у ім я пазнала аднакласніка — і накіроўваецца да сцэны. Ён выхоплівае мікрафон у сексапільнай спявачкі і бойка выкрыквае: «Землякі, выходзьце танчыць на пляцоўку!» І яны ідуць. З парасонамі і без, старыя і малыя, у спартыўных касцюмах і святочных уборах, з адточанымі рухамі і нязграбнымі, падзабытымі танцамі, «пад мухай» і абсалютна цвярозыя. Я зайздрошчу іх адкрытасці, лёгкасці, свабодзе і незакамплексаванасці.

Гляджу на сталую жанчыну, якая адна вырасціла траіх дзяцей, усё жыццё працуючы прыбіральшчыцай. Яна кружыць у вальсе са сваім парасонам. І так шчыра аддаецца танцу! Яна проста робіць тое, ад чаго можа атрымаць задавальненне роўна ў гэтую хвіліну. Яна шчаслівая тым, што мае. А мае яна самае галоўнае — унутранае шчасце, якое не залежыць ад абставін і заўсёды разам з ёй.

**Таццяна НЕМЧАНІНАВА,**
**заснавальніца дабрачыннага руху «Клуб 5000»**

■